ГЛЫБОЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГЛУБОКСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**РАШЭННЕ**

**РЕШЕНИЕ**

29 апреля 2026 г№ 522

г. Глыбокае

г. Глубокое

Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Міжнароднага свята “Вішнёвы фестываль”

На падставе пункта 35 Пераліка міжнародных і рэспубліканскіх цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, правадзімых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на рэгулярнай аснове, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 кастрычніка 2025 г. № 572, Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення Міжнароднага свята “Вішнёвы фестываль” (прыкладаецца).

2. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на намесніка старшыні Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта (далей – райвыканкам) Тарасевіч Т.Л., загадчыка сектара культуры райвыканкама Мацюшонак Т.В.

Старшыня М.С.Бакураў

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ ГЛУБОКСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТЬ Управление делами

УЗГОДНЕНА
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Віцебскі абласны
выканаўчы камітэт

Зак. 1820.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта
29.04.2026 №522

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення Міжнароднага свята “Вішнёвы фэстываль”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення Міжнароднага свята “Вішнёвы фэстываль” (далей – свята).

Свята праводзіцца з мэтай адраджэння і папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай, сусветнай культуры і мастацтва, арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва, папулярызацыі культурных традыцый па захаванні прыроднай і культурнай спадчыны, павышэння прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства калектываў мастацкай творчасці.

2. Арганізатарамі свята з’яўляюцца Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт (далей – райвыканкам), Віцебскі абласны выканаўчы камітэт, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (далей – арганізатары свята).

3. Свята мае статус міжнароднага.

4. Міжнароднае свята “Вішнёвы фэстываль” праводзіцца штогод.

5. Месцам правядзення свята з’яўляецца г. Глыбокае.

6. Для забеспячэння падрыхтоўкі і правядзення свята ствараецца арганізацыйны камітэт свята (далей – аргкамітэт), у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі дзяржаўных органаў (па ўзгадненні з іх кіраўнікамі) і іншых зацікаўленых арганізацый.

Склад аргкамітэта зацвярджаецца райвыканкамам.

7. Аргкамітэт:

7.1. ажыццяўляе кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем свята, пры неабходнасці стварае дырэкцыю свята;

7.2. уносіць на разгляд арганізатараў свята прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне свята, аб відах заахвочвання ўдзельнікаў святочных мерапрыемстваў;

7.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі свята;

7.4. разглядае і зацвярджае:

склад рэжысёрска-пастановачнай групы;

склад прэс-цэнтра;

спіс удзельнікаў свята;

праграму правядзення свята;

колькасць і склад журы мерапрыемстваў свята;

святочную сімволіку, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку;

план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні свята;

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення свята і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у час падрыхтоўкі і правядзення свята.

8. Рэжысёрска-пастановачная група:

8.1. уносіць на разгляд аргкамітэта прапановы па стварэнні агульнай канцэпцыі правядзення свята;

8.2. распрацоўвае сцэнарыі святочных мерапрыемстваў;

8.3. праводзіць рэжысёрска-пастановачныя і рэпетыцыйныя работы.

9. Свята мае свой лагатып, які прадстаўляе сабой "вішні-ноткі" з двума пялёсткамі. Унізе лагатыпа размешчаны надпіс "Вішнёвы фестываль". "Вішні-ноткі" лагатыпа сімвалізуюць весялосць, урачыстасць і музычнасць дадзенага свята.

10. У рамках свята прадугледжваецца правядзенне адкрыцця і закрыцця свята, конкурсу гарманістаў, баяністаў, акардэаністаў "Вішнёвыя найгрышы", этна-вечарыны "У вішнёвым садзе", гала-канцэрта творчых калектываў "Вішнёвая квецень сяброўства", плэнераў, канцэртных праграм калектываў мастацкай творчасці, выставак-кірмашоў работ майстроў розных відаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і рамяства, майстар-класаў, тэатралізаваных дзеянняў, іншых мерапрыемстваў, якія не супярэчаць мэтам свята.

11. У свяце прымаюць удзел аматарскія калектывы мастацкай творчасці і выканаўцы па розных відах мастацтва, майстры народных промыслаў (рамёстваў), спецыялісты ў галіне народнай творчасці, навуковыя работнікі, дзеячы культуры і мастацтва, іншыя работнікі культуры і творчыя работнікі (далей – удзельнікі свята) з Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

12. З мэтай шырокага асвятлення падзей свята запрашаюцца карэспандэнты спецыяльных і масавых айчынных і замежных выданняў, тэлевізійныя здымачныя групы, фотакарэспандэнты, якія могуць быць ініцыятарамі правядзення дыскусій, практычных і тэарэтычных майстар-класаў па абмену вопытам, відэапраглядаў і іншых мерапрыемстваў, якія адпавядаюць мэтам свята. Склад прэс-цэнтра зацвярджаецца аргкамітэтам свята.

13. Ганаровымі гасцямі свята могуць быць члены Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, афіцыйныя асобы замежных краін, супрацоўнікі замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў краін, гарады якіх з'яўляюцца пабрацімамі горада Глыбокае, міністры культуры і першыя асобы ведамасных устаноў культуры замежных краін, заслужаныя дзеячы культуры Рэспублікі Беларусь і іншых краін па прапанове аргкамітэта свята.

14. Заяўкі на ўдзел у конкурсах і мерапрыемствах накіроўвацца на адрас райвыканкама: г. Глыбокае, вул. Леніна, 42, тэл. +375215625897, e-mail: otdkul_pr@vitebsk.by у тэрмін, вызначаны аргкамітэтам.

15. У межах свята праводзіцца конкурс гарманістаў, баяністаў, акардэаністаў "Вішнёвыя найгрышы" (далей – конкурс), мэтай і задачамі якога з'яўляюцца:

адраджэнне і распаўсюджванне народнага інструментальнага мастацтва ў асяроддзі прафесіяналаў і аматараў;

адкрыццё новых імёнаў і талентаў у галіне інструментальнага мастацтва;

удасканаленне выканаўчага майстэрства інструментальнага мастацтва;

пазіцыянаванне сучаснага інструментальнага мастацтва як неад'емнай часткі культуры Рэспублікі Беларусь;

абмен творчымі ідэямі і практычным вопытам.

Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца аматарскія выканаўцы з Рэспублікі Беларусь і замежных краін. Па складу самадзейныя выканаўцы на народных інструментах (гармонь, баян, акардэон) могуць быць салісты, інструментальныя ансамблі. Выступленні могуць суправаджацца танцамі, песнямі, ігрой на іншых народных інструментах.

Умовы правядзення:

удзельнікі конкурсу павінны прадставіць 2 творы, рознабаковыя па характары: адно з іх павінна быть нацыянальнага характару альбо нацыянальнага аўтара;

працягласць кожнага твора не больш 4 хвілін пералік твора ў і парадак выступлення вызначае аргкамітэт.

Выступленне ўдзельнікаў ацэньвае журы. Склад журы конкурсу фарміруецца з ліку дзеячаў культуры і мастацтва, іншых работнікаў культуры і творчых работнікаў. Колькасць і склад журы вызначае аргкамітэт.

Крытэрыі ацэнкі ўзроўню выканальніцкай (інструментальнай) падрыхтоўкі:

ступень мастацкага ўвасаблення музычнага ладу твораў;

тэхнічная дасканаласць выканання;

ступень складанасці праграмы;

стылёвая і стылістычная разнастайнасць абранага музычнага матэрыялу.

Журы:

ацэньвае выкананне ўдзельнікамі конкурсу твораў;

афармляе пратаколы вынікаў выкананняў удзельнікамі конкурсу;

вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі;

інфармуе ўдзельнікаў конкурсу аб выніках іх удзелу ў конкурсе.

Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы закрытым галасаваннем па кожнаму з удзельнікаў конкурсу.

Рашэнні журы з’яўляюцца канчатковымі і перагляду не падлягаюць.

Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў:

лепшыя выканаўцы ўзнагароджваюцца дыпломам ”Гран-пры“ і дыпломамі Лаўрэата I, II, III ступеняў.

Удзельнікі, якія не занялі прызавыя месцы, могуць узнагароджвацца заахвочвальнымі дыпломамі ў намінацыях:

адраджэнне і распаўсюджванне традыцый музычнага мастацтва;

захаванне і прапаганда музычнага мастацтва;

выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі;

лепшае выкананне народнай музыкі;

лепшае выкананне твора патрыятычнай накіраванасці;

любоў да народнай музыкі;

захаванне нацыянальных традыцый;

актуальнасць і навізна зместу рэпертуару;

захаванне нацыянальнай культуры і спадчыны;

лепшае сольнае выкананне твору ў суправаджэнні калектыву.

16. У межах свята праводзіцца этна-вечарына “У вішнёвым садзе” (далей – этна-вечарына), мэтай і задачамі якой з’яўляюцца:

развіццё культурных сувязей і дружбы, ўмацаванне ўзаемаразумення, згуртаванні калектываў або народаў, а таксама выхаванні талерантнасці і павагі да традыцый іншых культур;

папулярызацыя, аднаўленне і захаванне беларускага народнага танца;

развіццё фальклорнага руху;

падтрымка і ўдасканаленне дзейнасці існуючых фальклорных калектываў.

Для ўдзелу ў этна-вечарыне запрашаюцца фальклорныя калектывы з Віцебскай вобласці, іншых абласцей Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

Умовы правядзення:

фальклорныя калектывы Беларусі і замежных краін прадстаўляюць мясцовы танец, народную гульню, фальклорную песню свайго рэгіёна з захаваннем адметнага стылю выканання, прэзентацыю адметнага элемента гісторыка-культурнай спадчыны свайго рэгіёна.

Патрабаванні да ўдзельнікаў:

адпаведнасць касцюма натуральнаму абрадаваму дзеянню, індывідуальнасць асобы, з выключэннем уніфікаванага стылізаванага строю;

выступленне ўдзельнікаў можа ажыццяўляцца пад акампанемент музычных інструментальных ансамбляў або пад музыку традыцынага складу ў жывым гучанні;

касцюмы ўдзельнікаў уяўляюць сабой варыянты арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў сваёй мясцовасці.

Выступленне ўдзельнікаў ацэньвае прафесійнае журы. Колькасць і склад журы вызначае аргкамітэт.

Журы:

афармляе пратаколы вынікаў выкананняў удзельнікамі этна-вечарыны;

вызначае пераможцаў этна-вечарыны;

інфармуе ўдзельнікаў этна-вечарыны аб выніках іх удзелу.

Падвядзенне вынікаў этна-вечарыны ажыццяўляецца журы закрытым галасаваннем.

Рашэнні журы з'яўляюцца канчатковымі і перагляду не падлягаюць.

Крытэрыі ацэнкі выступленняў:

жанравая разнастайнасць;

захаванасць мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;

здольнасць да імправізацыі;

узровень выканальніцкага майстэрства;

адпаведнасць касцюмаў традыцыйным народным строям сваёй мясцовасці.

Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў:

Усе ўдзельнікі атрымліваюць дыпломы за ўдзел у этна-вечарыне. Лепшыя калектывы ўзнагароджваюцца дыпломамі ў намінацыях, якія вызначае журы.

17. У межах свята праводзіцца гала-канцэрт “Вішнёвая квецень сяброўства” (далей – гала-канцэрт), мэтай якога з'яўляецца развіццё і ўмацаванне культурных сувязей на падставе духоўных каштоўнасцей, папулярызацыя лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай, сусветнай культуры і мастацтва, арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

Для ўдзелу ў гала-канцэрце запрашаюцца вакальныя, харэаграфічныя і інструментальныя аматарскія калектывы з Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

Умовы правядзення:

працягласць выступлення і колькасць нумароў вызначае аргкамітэт;

колькасны склад творчага калектыву вырашае аргкамітэт.

усе ўдзельнікі гала-канцэрта ўзнагароджваюцца дыпломамі.

18. Удзельнікі свята могуць ўзнагароджвацца памятнымі сувенірамі (па ўзгадненні з аргкамітэтам).

19. Фінансаванне падрыхтоўкі і правядзення свята ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага, абласнога, раённага бюджэтаў у межах сродкаў, прадугледжаных дзяржаўнымі органамі на правядзенне цэнтралізавах мерапрыемстваў, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.